Истчоник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-11-22

# Вайскоўцы на карцінах

У мастацкай галерэі імя Міхаіла Савіцкага адкрылася выстаўка Студыі ваенных мастакоў «Спадкаемцы Перамогі», прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прайшло ўжо дзесяць гадоў, як працуе вышэйзгаданая студыя. Яе кіраўнік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Мікалай Апіёк, лічыць галоўнай мэтай аб'яднання беларускіх мастакоў розных пакаленняў развіццё ваенна- і гераічна-патрыятычнай тэмы ў выяўленчым мастацтве, а асноўнай задачай — стварэнне і прапаганду высокамастацкіх твораў, што выхоўваюць патрыятызм і маральнасць чалавека. За час існавання Студыі ваенных мастакоў было праведзена больш як 30 выставак у музеях сталіцы, абласных гарадах і раённых цэнтрах, гарнізонах, а таксама персанальныя выстаўкі ўдзельнікаў студыі народных мастакоў Беларусі Георгія Паплаўскага і Івана Міско, заслужаных дзеячаў мастацтва Беларусі Мікалая Апіёка, Леаніда Дударэнкі, Уладзіміра Церабуна, Уладзіміра Уродніча, мастакоў Уладзіміра Гардзеенкі, Георгія Лойкі, Аляксея Кузьміча і іншых.

У экспазіцыі наведвальнікі ўбачылі творы ваеннай тэматыкі: армейскае жыццё, ваенныя вучэнні, а таксама рэалістычныя пейзажы, напісаныя ў розныя часы. Мастакі студыі праз творы імкнуцца данесці сённяшняй моладзі тое, што перажыта старэйшым пакаленнем, і захаваць у памяці нашчадкаў подзвіг, якому няма роўнага ў гісторыі. Гэта і падзяка ўсім, хто прынёс нам Вялікую Перамогу. Вобразнае адлюстраванне воінскага подзвігу, лёс грамадзяніна і патрыёта — сімвал гонару і доўгу пакалення вогненных 40-х. Усё гэта шырока адлюстравана ў сюжэтна-тэматычных карцінах і партрэтах выстаўкі. Тэма сучаснасці ў палотнах розных жанраў прысвечана павазе да працы, духоўнаму жыццю сённяшніх воінаў.




*Замалёўкі на ваенных вучэннях «Захад-2013». Малюе Мікалай Апіёк.*

На адкрыцці выстаўкі «Спадкаемцы Перамогі» з прывітальным словам выступіў былы прэзідэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, акадэмік Расійскай АН Мікалай Барысевіч. Ён перадаў галерэі ў дар карціну Народнага мастака Міхаіла Савіцкага «Пераправа», якую аўтар у свой час прэзентаваў Мікалаю Барысевічу.

**Галіна ФАТЫХАВА**

Галіна Фатыхава. Вайскоўцы на карцінах